ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 4 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

*УДК 94(476:430)«1945/1948»*

*Н. В. БАРАБАШ*

# РЭПАРАЦЫІ З ГЕРМАНІІ Ў БЕЛАРУСЬ У 1945–1948 гг.

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка, Мінск, Беларусь,*
*e-mail: barabash-n@bk.ru*

Статья посвящена одной из наименее исследованных военных и социально-экономических тем в отечественной историографии – репарационным поставкам промышленного оборудования, материалов различного назначения, инструмента из Германии в Беларусь после окончания Второй мировой и Великой Отечественной войны. В соответствии с решениями Ялтинской и Потсдамской конференций (1945 г.) БССР как одна из наиболее пострадавших в годы войны стран, член ООН получила право на получение репараций из Германии, а также ее бывших союзников. В течение 1945–1948 гг. главным образом из Германии, в меньшей степени из Австрии и Венгрии в БССР поступало демонтированное промышленное оборудование, различные станки, материалы, инструменты, которые распределялись по различным отраслям промышленности нашей республики. Показана роль партийно-советского руководства Беларуси, которое организовывало и контролировало процесс получения репараций.

*Ключевые слова*: репарации, промышленность, промышленное оборудование, компенсации, трофейное оборудование, ООН, ЮНРРА.

*N. V. BARABASH*

## REPARATIONS FROM GERMANY TO BELARUS DURING THE 1945–1948 YEARS

*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus,*
*e-mail: barabash-n@bk.ru*

Article is dedicated to the one of unknown pages of the Belarusian military and social-economic history.

After World War II and Great Patriotic War Belarus has been estimated as one of the most suffered from the war and occupation countries. As a member of the United Nation Organization (UNO) and in accordance with decisions of the International Conferences in Yalta and Potsdam (1945) Belarus had received the reparation from the Germany. During 1945–1945 years Belarus received various equipment, materials, tools from plants and factories from Germany and it's alliances as Hungary and Austria. These reparations have been used for various branches of industry in Belarus. Author of the article shows the role of the Party and Soviet leading body which was the Central Committee of the Communist party of Belarus in process of organization of reparation supplying from Germany to Belarus and its distributing to plants and factories of our Republic.

*Keywords:* reparations, industry, industrial equipment, indemnities, captured equipment, UNO.

Адной з маладаследаваных тэм у айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца тэма рэпарацыйных паставак прамысловага абсталявання, матэрыялаў, інструментаў з Германіі ў Беларусь пасля заканчэння Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны. Памер і формы рэпарацый былі вызначаны саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі на Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях. Было прынята рашэнне, што рэпарацыі будуць ажыццяўляцца не ў грашовай, а ў натуральнай форме, у тым ліку за кошт дэмантажу і прамысловай прадукцыі нямецкіх прадпрыемстваў, а таксама выкарыстання працы нямецкіх ваеннапалонных.

Саюзнікі вызначылі агульны аб'ём рэпарацый у 20 млрд долараў, што было значна менш за рэальную суму, паколькі па падліках, якія праводзіліся ў Савецкім Саюзе, толькі прамыя страты склалі 128 млрд долараў. Пры гэтым палавіну, г. зн. 10 млрд павінны былі атрымаць Савецкі Саюз і Польшча як краіны, якія найбольш пацярпелі ад вайны [1, с. 342]. Адзначым, што на сённяшні дзень неабходна лічыць і Беларусь як краіну, якая таксама панесла вялізныя матэрыяльныя страты ў гады вайны. Так, толькі прамыя народнагаспадарчыя страты Беларусі ў выніку вайны склалі 75 млрд руб (у цэнах 1941 г.). Было страчана звыш паловы нацыянальнага багацця рэспублікі, у той час як па СССР у цэлым страты складалі каля 30% яго нацыянальнага багацця.

© Барабаш Н. В., 2015

Па некаторых найбольш важных галінах (прамысловасць, энергетыка) эканоміка была адкінута да ўзроўню 1913 г., а па агульным узроўні развіцця – да 1928 г. [2, с. 336]. Рэпарацыі асобна для Беларусі не разглядаліся, паколькі яна ўваходзіла ў склад СССР як саюзная рэспубліка. Нягледзячы на тое, што памеры страт для Беларусі склалі такую вялізную суму (75 млрд руб., ці 15 млрд долараў), для рэспублікі была вызначана сума ў 1,5 млрд долараў, ці 7,5 млрд руб. [1, с. 342].

Саюзнікі пагадзіліся, што рэпарацыйныя прэтэнзіі СССР будуць задаволены за кошт усходняй зоны Германіі, а таксама германскіх актываў, якія знаходзіліся ў Балгарыі, Фінляндыі, Венгрыі, Румыніі і Усходняй Аўстрыі. Акрамя гэтага, Савецкі Саюз павінен быў атрымаць і некаторую частку рэпарацыйных плацяжоў з заходніх зон Германіі, аднак гэта рашэнне заходнімі краінамі поўнасцю не было выканана.

25 лютага 1945 г. для агульнага кіраўніцтва дзейнасцю па атрыманні рэпарацый быў створаны Асобы камітэт пры Дзяржаўным Камітэце Абароны (ДКА) пад кіраўніцтвам Г. М. Малянкова, у які ўваходзілі начальнік Галоўнага трафейнага ўпраўлення Чырвонай Арміі генерал-лейтэнант Ф. Вахітаў. Пасля скасавання ДКА СССР 3 верасня 1945 г. Асобы камітэт перайшоў у падпарадкаванне СНК СССР. Пасля заканчэння ваенных дзеянняў і першых месяцаў акупацыі Германіі пытанні рэпарацый уваходзілі ў кампетэнцыю Эканамічнага ўпраўлення Савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі (СВАГ) на чале з генералам Шабаліным. У снежні 1945 г. яго функцыі перайшлі да намесніка галоўнакамандуючага СВАГ па эканамічных пытаннях К. І. Коваля.

Пастановай ДКА СССР ад 21 сакавіка 1945 г. пытанні дэмантажу прамысловых прадпрыемстваў былі ўскладзены на Наркамбуд СССР. Па колькасці франтоў былі створаны яго падведамасныя структуры – чатыры Асобыя мантажныя ўпраўленні, у распараджэнне якіх накіравалі сотні інжынераў, тэхнікаў, кваліфікаваных рабочых, 5 дэмантажных батальёнаў у складзе 5 тыс. чалавек, 10 рабочых батальёнаў у складзе 5 тыс. чалавек, 5 асобных аўтабатальёнаў з трактарнымі ўзводамі, выдзелілі дадаткова 650 грузавых машын і трактароў [1, с. 343].

Адзначым, што ДКА СССР і асабіста І. Сталін як яго старшыня неаднаразова на пасяджэннях ДКА разглядалі пытанні, якія закраналі пастаўкі прамысловага абсталявання і матэрыялаў з Германіі ў Беларусь. Так, напрыклад, на пасяджэннях ДКА СССР у 1945 г. у сакавіку разглядаліся 2 пытанні, у красавіку адпаведна – 14, маі – 22, чэрвені – 19, ліпені – 20, жніўні – 5 [3, с. 135–202]. Такім чынам, толькі на працягу 1945 г. ДКА СССР разгледзеў 82 пытанні, якія датычыліся рэпарацыйных паставак з Германіі ў Беларусь. Аналіз паказвае, што найбольшая колькасць пытанняў рэпарацыйных паставак у БССР разглядалася ДКА СССР на працягу мая – жніўня 1945 г. На нашу думку, гэта было абумоўлена тым, што ў маі скончылася Вялікая Айчынная вайна і чыгуначны транспарт у значнай ступені вызваліўся ад ваенных перавозак. У сувязі з гэтым летам 1945 г. з'явілася магчымасць выдзеліць пад перавозкі матэрыялаў і абсталявання неабходную колькасць чыгуначнага транспарту.

У рэспубліку з вясны 1945 г. інтэнсіўна пачалі паступаць разнапланавыя матэрыялы і абсталяванне. Так, напрыклад, 9 сакавіка 1945 г. ДКА СССР прыняў пастанову, у адпаведнасці з якой у Мінск для Упраўлення па справах паліграфіі і выдавецтваў пры СНК БССР з г. Беўцен вывозілася абсталяванне і матэрыялы нямецкай тыпаграфіі выдавецтва «Обершлезішер Гезельшафт Друкарай», у тым ліку: 1 ратацыйную газетную машыну, 3 плоскія пячатныя машыны, 2 амерыканкі і 3 наборныя машыны «Лінатып». 13 красавіка 1945 г. ДКА СССР прыняў пастанову «Аб вывазе з нямецкіх абутковых фабрык фірм "Календ-Норыс" і "Эва-Лукус" г. Ландзберг (Германія, Брандэнбург)» 87 абутковых машын, 139 швейна-нарыхтоўчых і 49 машын па апрацоўцы і штампоўцы краю на Мінскую абутковую фабрыку [3, с. 145, 155]. Матэрыялы і абсталяванне паступалі не толькі ў Мінск, але і на розныя прадпрыемствы рэспублікі як саюзна-рэспубліканскага, так і мясцовага значэння – Аршанскі льнокамбінат, Гомсельмаш, Гомельскі і Віцебскі малочныя заводы, Гомельскі станкабудаўнічы завод, Рэчыцкі і Мазырскі лесакамбінаты, БЕЛГРЭС, Гомельскі суднарамонтны і паравозарамонтны заводы, Скідальскі масласырзавод, кардонную фабрыку «Альберцін», Віцебскую фабрыку «КІМ», Мінскі веласіпедны завод (на які вывезлі 1055 металарэжучых станкоў і 300 адзінак featureнага абсталявання, а таксама матэрыялы і розны інструмент з веласіпеднага завода фірмы «Брэнабер» і яго філіяла з Брандэнбургу) [3, с. 145; 155; 161; 165–167; 173; 176; 177], а таксама на іншыя прадпрыемствы. Такім чынам, у рэспубліку накіроўвалася прамысловае абсталяванне і матэрыялы практычна па ўсіх асноўных галінах вытвор-

часці, якія існавалі ў Беларусі ў перадваенны час і, галоўнае, якія планавалася развіваць у пасляваенны перыяд. Безумоўна, у першую чаргу абсталяванне і матэрыялы перадаваліся прадпрыемствам саюзна-рэспубліканскага, рэспубліканскага ўзроўню, аднак значная частка накіроўвалася і на прадпрыемствы мясцовай прамысловасці.

Неабходна адзначыць, што частка прамысловага абсталявання паступала ў Беларусь не толькі з Германіі, але і з краін-сатэлітаў Германіі – Аўстрыі і Венгрыі. Так, напрыклад, рашэннем ДКА СССР ад 26 красавіка 1945 г. на Гомельскі станкабудаўнічы завод было вывезена 122 металаапрацоўчыя станкі, абсталяванне, інструмент і матэрыялы з механічнага завода фірмы «Шэшберг» ст. Ацырсдорф (г. Вена). Гэтая ж пастанова прадугледжвала вываз з нямецкіх аўтамабільных заводаў, якія размяшчаліся ў Вене (фірма «Аўстра-Фіят»), усё наяўнае абсталяванне, інструмент і матэрыялы на Мінскі аўтазборачны завод [3, с. 165]. З Венгрыі на Барысаўскі аўтарамонтны завод паступілі 70, а на Мінскі радыёзавод – 150 металаапрацоўчых станкоў [4, арк. 226, 242]. Аднак гэтыя пастаўкі займалі нязначную частку. Абсалютная большасць абсталявання і матэрыялаў паступала ў рэспубліку з дэманціраваных прадпрыемстваў Германіі.

Адзначым, што партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі, перш за ўсё ЦК КП(б)Б, кантралявала і рэгулярна разглядала пытанні, якія датычыліся рэпарацыйных паставак, што выдзяляліся рэспубліцы па лініі ДКА СССР. Так, напрыклад, 5 ліпеня 1945 г. (час найбольш інтэнсіўных перавозак абсталявання ў рэспубліку. – *Н. Б.*) ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб дэмантажу і перавозцы прамысловых прадпрыемстваў і абсталявання, выдзеленых рашэннем Дзяржаўнага Камітэта Абароны для Беларускай СССР» [5, арк. 1]. У ёй адзначалася, што ў працэсе дэмантажу, перавозкі прымысловага абсталявання і матэрыялаў, якія выдзяляюцца рашэннямі ДКА СССР для Беларусі, маюцца «буйнейшыя недахопы»: частковы дэмантажу, дрэнная ўпакоўка абсталявання, страты матэрыялаў і іх пашкоджанне пры транспарціроўцы ў Беларусь і г. д. У сувязі з гэтым ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне аб камандзіраванні дырэктараў прамысловых прадпрыемстваў для дэмантажа і суправаджэння прымысловых прадпрыемстваў да месца прызначэння. Восенню 1945 г. у Германію былі накіраваны 54 дырэктары ці іх намеснікі рэспубліканскіх прадпрыемстваў [5, арк. 2–3], якія на месцах непасрэдна кантралявалі працэс дэмантажу, пагрузкі і адпраўкі дэманціраваных прадпрыемстваў, матэрыялаў і абсталявання ў Беларусь.

Дэмантаж і перавозка ў СССР дэманціраванага абсталявання і матэрыялаў вымусілі саюзнае кіраўніцтва стварыць 5 перавалачных баз для яго захоўвання – чатыры на тэрыторыі Польшчы і адну – у Брэсце. Саюзныя наркаматы, якія атрымоўвалі гэтае абсталяванне, арганізоўвалі часовыя склады. У Мінску такія склады меліся ў наркаматаў сярэдняга машынабудавання, электрастанцый і авіяцыйнай прамысловасці. На іх дастаўляліся матэрыялы і абсталяванне, якое потым перапраўлялася ў цэнтральныя вобласці СССР. Абсталяванне, якое прызначалася для Украіны, Беларусі і Прыбалтыйскіх рэспублік, паступала непасрэдна на прадпрыемствы гэтых рэспублік.

8 мая 1945 г. сумеснай пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР № 648–275 сс для кіраўніцтва ўсёй работай па вяртанню прамысловых прадпрыемстваў і народнагаспадарчай маёмасці, вывезенай немцамі з Беларусі, і забеспячэнню вывазу прамысловых прадпрыемстваў, абсталявання, сельскагаспадарчага інвентару і іншай маёмасці ў БССР у адпаведнасці з рашэннем ДКА СССР была створана аператыўная група пры СНК БССР. Група павінна была вырашаць наступныя пытанні: кантроль за работай наркаматаў па своечасовым вывазе прамысловых прадпрыемстваў і народнагаспадарчай маёмасці ў рэспубліку; узгадненне з саюзнымі наркаматамі і ўпаўнаважанымі ДКА СССР на франтах прапаноў аб завозе прамысловых прадпрыемстваў і іншай народнагаспадарчай маёмасці ў Беларусь; падрыхтоўка прапаноў для ўнясення ў Асобы камітэт, які займаўся пытаннямі рэпарацый. У Апергрупу ўваходзіла 5 чалавек: М. Прохараў, загадчык ваеннага аддзела ЦК КП(б)Б; І. Куцейнікаў (СНК БССР); І. Жыжаль (Дзяржплан БССР); А. Андрэеў (прамысловы аддзел ЦК КП(б)Б); К. Антонаў (намеснік наркама земляробства БССР) [6, арк. 66, 68]. У яе распараджэнне таксама былі накіраваны К. Бакіноўскі (Наркамат камунальнай гаспадаркі БССР); Б. Філіпскіх (Мінскі абкам КП(б)Б); У. Ширшоў (СНК БССР); А. Звонак (Наркамат мясцовай прамысловасці БССР); Ф. Хашкоўскі (ЦК КП(б)Б); І. Міронаў (Наркамат лёгкай прамысловасці БССР); Б. Парэмскі (Наркамат мясцовай паліўнай прамысловасці БССР); Б. Пражка (намеснік начальніка Мінскага аддзялення руху Заходняй чыгункі па мабілізацыйнай рабоце) [7, арк. 16, 39].

Каардынацыю дзейнасці ўсіх груп і сувязь з СВАГ ажыццяўлялі ўпаўнаважаныя СНК БССР ЦК КП(б)Б у Берліне У. Забела, А. Шаўроў і М. Прохараў.

Пастановай ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 9 кастрычніка 1945 г. быў зацверджаны новы склад групы: Л. Гарэлік (начальнік); І. Захараў (ЦК КП(б)Б) – адказны арганізатар па транспарце; І. Карандзей (Наркамат харчовай прамысловасці, адказны арганізатар па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню); Русецкі (Наркамат тэкстыльнай прамысловасці, начальнік штаба групы); І. Жыжаль (Дзяржплан, адказны арганізатар па ўліку і справаздачнасці) [8, арк. 17–18]. М. Прохараў (ЦК КП(б)Б) кантраляваў падрыхтоўку і адпраўку грузаў [9, арк. 1, 13].

Апергрупа кіравала спецыяльнымі ўрадавымі групамі, якія былі накіраваны ў Германію: Берлінскай (цэнтральнай) кіраваў М. Кагальніцкі. Акрамя гэтага, былі створаны Памеранская (кіраўнік Гарачкін), Брандэнбургская (Кальніцкі), Саксонская (Дружалоўскі), Мекленбургская (Крывашэеў), Англасаксонская (Захватаў), Цюрынгская (Кармілкін) групы [10, арк. 1]. У Кёнігсбергу, Інстэнбургу, Растоку і Брэсце меліся перавалачныя базы. Групы пэўнай мабільнасці і іх структура, колькасць членаў групы маглі мяняцца, ліквідаваліся і ствараліся новыя базы і спецгрупы. Апергрупа знаходзілася на самастойным балансе і фінансавалася Галоўным упраўленнем забеспячэння СНК БССР.

На 1 лістапада 1945 г. у Германіі знаходзілася 456 прадстаўнікоў Беларусі, накіраваных СНК БССР для дэмантажу і вывазу абсталявання. Пастановай СНК СССР, ДКА, рашэннямі СВАГ вывазу ў Беларусь падлягала 221 прамысловае прадпрыемства, дзе налічвалася 21 981 адзінка тэхналагічнага абсталявання, у тым ліку 12 194 розных станкоў. З ліку выдзеленых прадпрыемстваў 79 прызначаліся для прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання, 142 – для саюзна-рэспубліканскага падпарадкавання [1, с. 346]. Адзначым, што ў гэтую колькасць былі ўнесены значныя карэктывы. Так, 46 прамысловых прадпрыемстваў з колькасцю 2838 адзінак тэхналагічнага абсталявання былі выключаны з гэтага спісу, паколькі Адміністрацыя СВАГ прыняла рашэнне пакінуць частку прадпрыемстваў на месцы, а частка ўжо была перададзена іншым арганізацыям і вывезена ў Савецкі Саюз. Такім чынам, агульная колькасць прамысловых прадпрыемстваў, якія падлягалі адпраўцы ў Беларусь, склала 175 прадпрыемстваў [11, с. 361], а не 221, як сцвярджае І. Варанкова [1, с. 346] з колькасцю тэхналагічнага абсталявання 19 140 адзінак, з якіх 9710 складалі металаапрацоўчыя станкі.

Адзначым, што ў рэспубліку дэманціраваныя нямецкія прадпрыемствы пачалі паступаць вельмі хутка. Так, па стану на 1 лістапада 1945 г. у БССР ужо паступілі поўнасцю ці часткова дэманціраваныя 75 прадпрыемстваў з колькасцю тэхналагічнага абсталявання 6230 адзінак, у тым ліку металаапрацоўчых станкоў – 1747 адзінак. Важнае месца ў пастаўках займала сельскагаспадарчае абсталяванне. Так, Белсельгасзабеспячэнне атрымала ў гэтым годзе 1214 вагонаў, у якіх было прывезена 790 уборачных машын, 844 малацілкі, 187 трактароў, 130 станкоў і іншае абсталяванне [11, с. 361–362].

Мінская вобласць атрымала найбольшую колькасць прамысловых прадпрыемстваў. Так, напрыклад, па стану на ліпень 1945 г. у Мінскую вобласць было вывезена 17 прадпрыемстваў, у тым ліку 8 саюзнага падпарадкавання, у Магілёўскую адпаведна 8 і 3, Бабруйскую – 6 і 1, Полацкую – 2, Гродзенскую – 5, Гомельскую – 17 і 5, Віцебскую – 11 і 5, Брэсцкую – 1, Пінскую – 3, Баранавіцкую – 2, Палескую – 4 [5, арк. 69].

Якія ж былі вынікі рэпарацыйных паставак у Беларусь? Усяго ў 1945–1948 гг. у Германіі па дэмантажу прадпрыемстваў працавала каля 800 чалавек з Беларусі [1, с. 346]. З савецкай зоны акупацыі ў Беларусь у 1945 – 1948 гг. было вывезена 21 602 вагоны агульнай вагой 268 829 т рознага абсталявання, металаканструкцый, інструменту, рознага інвентару і матэрыялаў агульнай колькасцю 59 848 адзінак. Яны размяркоўваліся наступным чынам: для міністэрстваў і ведамстваў рэспубліканскага падпарадкавання было вывезена 32 147 адзінак, саюзна-рэспубліканскага адпаведна – 6985, саюзнага – 20 716 [10, арк. 6–7]. Абсалютную большасць абсталявання (16 483 адзінкі) складалі сельскагаспадарчыя машыны, другое месца займала абсталяванне станкабудаўнічай, машынабудаўнічай, металаапрацоўчай і ліцейнай вытворчасці – 11 346 адзінак, трэцяе месца займала абсталяванне тэкстыльнай і трыкатажнай прамысловасці – 7176 [10, арк. 7–10]. Астатняе абсталяванне размяркоўвалася практычна па ўсіх галінах вытворчасці, якія існавалі ў рэспубліцы.

На ўсё вывезенае абсталяванне, станкі, матэрыялы, металаканструкцыі была складзена падрабязная тэхнічная дакументацыя, якая была перададзена адпаведным міністэрствам і ведамствам. Цікава адзначыць, што ў Беларусь завезлі 600 вагонаў «рознай бытавой маёмасці» – піяніна, раялі, посуд, кабінетныя гадзіннікі і іншыя прадметы.

Адзначым, што прадпрыемствы рэспублікі, кіраўнікі прадпрыемстваў, партыйна-савецкае кіраўніцтва абласцей і раёнаў, куды паступала прамысловае абсталяванне, у шэрагу выпадкаў не былі гатовы прыняць у кароткія тэрміны вялікую колькасць абсталявання. Так, 11 верасня 1945 г. бюро ЦК КП(б)Б разгледзела пытанне «Аб захаванні абсталявання, якое прыбыло з Германіі, на Крычаўскім цэментным і Клімавіцкім сілікатным заводах» [12, арк. 29] і канстатавала, што «захаванне абсталявання, якое прыбыло з Германіі, на Крычаўскім цэментным і Клімавіцкім сілікатным заводах знаходзіцца ў надта нездавальняючым стане. Абсталяванне знаходзіцца пад адкрытым небам і заржавела. Пры выгрузцы абсталявання на Крычаўскім цэментным заводзе значная частка абсталявання пашкоджана […]. Кіраўніцтва заводамі да прыёму і захавання абсталявання не падрыхтавалася» [12, арк. 30]. Улічваючы такую сітуацыю, ЦК КП(б)Б абвясціў вымову дырэктарам заводаў за «халатныя адносіны да прыёму і захавання абсталявання». Аналагічная сітуацыя назіралася на Добрушскай фабрыцы «Герой працы», заводзе «Гомсельмаш» і Рэчыцкай мэблевай фабрыцы [1, с. 349–359]. Аднак дзеля справядлівасці адзначым, што меліся і аб’ектыўныя прычыны, якія не дазвалялі належным чынам прыняць дэманціраванае абсталяванне. На Крычаўскі цэментны завод з г. Опельн было адгружана 349 вагонаў дэманціраванага абсталявання з цэментнага завода. На ст. Крычаў абсталяванне прыбыло на 7 эшалонах, прычым эшалоны колькасцю 45–50 вагонаў прыбывалі ў Крычаў кожныя два дні [4, арк. 213–214]. Зразумела, што прыняць, разгрузіць, складзіраваць такую колькасць абсталявання за два дні было надзвычай складана. На заводзе не хапала складскіх памяшканняў, новыя не паспелі пабудаваць, таму і склалася такая сітуацыя з яго захаваннем.

Напрыканцы 1948 г. група СНК БССР па дэмантажу абсталявання ў Германіі была ліквідавана. Такім чынам, амаль трохгадовая праца па дэмантажу і перавозцы прамысловага абсталявання з Германіі ў Беларусь была завершана. Рэпарацыйныя пастаўкі з Германіі ў БССР у пасляваенны аднаўленчы перыяд адыгралі значную ролю ў нарошчванні эканамічнага патэнцыялу нашай краіны. Неабходна пагадзіцца з высновай І. Варанковай [1, с. 353], што многія дэманціраваныя прадпрыемствы з Германіі заклалі падмурак для стварэння новых галін прамысловасці – трактарнай, аўтамабільнай, станкабудаўнічай і іншых, а дзякуючы высокатэхналагічнаму абсталяванню з нямецкіх прадпрыемстваў да канца 1948 г. удалося аднавіць большасць фабрык і заводаў і падняць узровень вытворчасці да сярэднямесячнага ўзроўню 1940 г.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Воронкова, И. Ю.* К вопросу о трофейных и репарационных поставках из Германии в Белорусскую ССР (1945–1948 гг.) / И. Ю. Воронкова // Великая Отечественная война в исторической судьбе белорусского народа: материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 65-летию победы в Великой Отечественной войне (Гродно, 4–5 мая 2010 г.) / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории, Гродн. гос. ун-т им. Янки Купалы; Департамент по архивам и делопроизводству М-ва юстиции Респ. Беларусь; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2012. – С. 342–354.

2. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. для студэнтаў экан. спецыяльнасцей ВНУ / В. І. Галубовіч. – 3-е выд. дап. і перапрац. / В. І. Галубовіч, Р. І. Ермашкевіч, Г. П. Бушчык [і інш.]. – Мінск: ВП “Экаперспектыва”, 1999. – 446 с.

3. Беларусь в постановлениях и распоряжениях Государственного Комитета Обороны СССР, 1941–1945 гг.: справочник / сост.: В. Д. Селеменев [и др.]. – Минск: НАРБ, 2008. – 214 с.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 4 п. Воп. 29. Спр. 821. Арыгінал.

5. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп.61. Спр. 172. Арыгінал.

6. НАРБ. – Ф.4 п. Воп.61. Спр. 150. Арыгінал.

7. НАРБ. – Ф .4 п. Воп.61. Спр. 151. Арыгінал.

8. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп.61. Спр. 204. Арыгінал.

9. НАРБ. – Ф.4 п. Воп.61. Спр. 205. Арыгінал.

10. НАРБ. – Ф. 899. Воп.1. Спр. 3. Арк. 1. Арыгінал.

11. Освобожденная Беларусь: документы и материалы: в 2 кн. / сост. В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2005. – Кн. 2: Январь-декабрь 1945 / В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2005. – 504 с.

12. НАРБ. – Ф. 4 п. Воп. 61. Спр. 197. Арыгінал.



*Паступіў у рэдакцыю 07.07.2015*